# ЗМЕСТ

**На вайне**
*Гістарычная аповесць* . . . . . . . . . . . . . . . . 4

**Памяць пра легенды**
«Рогволожи внуци» . . . . . . . . . . . . . . . . 68
Глосы да часоў Жыгімонта Старога . . . . 108
«Выбар зроблены...» . . . . . . . . . . . . . . 138
Начальнік паўстання . . . . . . . . . . . . . . 173
«Насустрач уласнай пагібелі» . . . . . . . . 202

**Літаратурна-гістарычныя эсэ**
Пасечаная дынастыя . . . . . . . . . . . . . . 240
Дачка Вітаўта . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 247
Нашчадак князя Вітаўта . . . . . . . . . . . 255
Пачатак канца . . . . . . . . . . . . . . . . . . 262
Удача Яна Казіміра Сапегі . . . . . . . . . . 270
Сум Агінскага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 278
Вялікае герцагства Літоўскае . . . . . . . . 285
Уз’яднанне Беларусі . . . . . . . . . . . . . . 292

*Заўвагі* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 299

## Навальніца

30 чэрвеня гарматы сапежынскай дывізіі пачалі абстрэл Менску. Гарнізону ў крэпасці было мала, і гарматы прыстрэльваліся да брамаў і гарадскога вала. Два наступныя дні артылерыя працягвала сваю працу, і 3 ліпеня 1660 году харугва палкоўніка Вараньковіча па прабітым у браме праёме ўвайшла ў горад. Расейскія салдаты здаліся, але з пяцісот двароў чатырыста былі спаленыя, і гэта вызначыла сумны лёс стральцоў. Ваяводскі Менск быў другім горадам, вызваленым ад шасцігадовага захопу расейцамі, у шэрагах дывізіі панавала весялосць, і, дзякуючы гэтай весялосці, харугва Вараньковіча, якая першая ўступіла ў горад, атрымала двухмесячны адпачынак.

Дарысіўшы да сваіх месцаў у Ігуменскай воласці, два дзясяткі шляхцічаў і драбаў рассыпаліся па лясных і балотных прасёлках — кожны спяшаўся на свой двор. Дачакаўся павароту на родныя Дымы і паручык Юры Матулевіч; тут, на раздарожжы, развітаўся ён з прыяцелямі, якім было ехаць далей, і забыўся на іх, радуючыся блізкай сустрэчы з бацькам, якога не бачыў пяць гадоў.

Да Юр'я ехаў пагасцяваць Стась Рэшка — даўні, з гадоў вучэння ў Полацкім калегіюме, цалкам безграшовы прыяцель. Наводдаль шляхцічаў ішлі пры клуначных канях тры драбы — усе мясцовыя.

Дзень быў душны, з поўдня збіралася навальніца — і сабралася. Чорныя хмары, загасіўшы святло, пачалі туліцца да зямлі; лес і трава замерлі ў пакорнасці. Паветра здрыганулася, рэдка стукнулі кроплі, згусцеў змрок. Да Дымоў заставалася пяць вёрстаў. Было ясна, што навальніцу не абагнаць, і, убачыўшы наперадзе капліцу, Юры вырашыў атуліцца пад святой страхой. Аднак набожнага Стася Рэшку нешта ў капліцы збянтэжыла; ён хутка вышукаў, што — дзверы былі сарваныя, усярэдзіне злежалася смецце, не ставала на ёй крыжа, — толькі абломак яго бадліва тырчэў пасярэдзіне вільчыка. Пазней, калі дзень прыезду ў Дымы ўсплываў у памяці сваімі напамінамі, Юры пакутаваў ад таго, што не паслухаў прыяцеля, а з насмешкай загадаў спешыцца. Ды і чаго было палохацца, калі столькі набачыліся за пяць гадоў спаленых касцёлаў, абадраных грэка-уніяцкіх цэркваў, столькі пабітага ў гэтых касцёлах народу, ды і самі не адзін раз у цэрквах, як у карчме, начавалі. Бо не нячысцікі абразы палілі, на алтарах шаблямі шыі секлі. Ці ў гэтую капліцу нячысцікі дзверы выбілі, крыж зламалі і знеслі распяцце?..

Толькі занеслі ў капліцу мяхі і сёдлы, як наўскось неба ўспыхнуў агністы глыбокі шнар — нібы ўрэзалася ў брушыну цемры

і рассекла яе да крыві нябачная шабля. Асляпленую цішыню разарваў гром, і струмені грукнулі ў дарогу, траву, капліцу.

Юры, Стась і драбы перахрысціліся. Праз дарогу насупраць каплічкі, у суцэльным патоку вады выявілася чалавечая фігура — нібы выскачыла з непрыкметнай за дажджом ямы. Юры з цікаўнасцю чакаў падарожніка. А той аказаўся жанчынай, пакрытай вялікай сіняй хустай. Яна ступіла пад застрэшша, прывіталасяківам і прыціснулася спінай да зруба. Нядоўга так пастаяўшы, зняла і пачала адціскаць хусту — і Юры адразу пазнаў шаптуху Эўку. Чорныя валасы крылом ляжалі на кашулі, а мокрая кашуля цесна абляпіла цела, выявіўшы дужыя грудзі; насычаная вадой чырвона-сіняя спадніца шчыльна аблягала сцёгны.

Драбы таксама пазналі шаптуху, і хтосьці прастадушна выгукнуў: «Эўка!», уклаўшы ў слова і радасць, што нарэшце ўбачыўся на радзіме знаёмы твар, і нейкую непрыязнасць, што першы сустрэчны мясцовы чалавек — шаптуха, а можа быць, і вядзьмарка.

— Во, Пярун лупіць! — адазваўся таварыш.

Стась Рэшка запытальна паглядзеў на драбаў; тыя прысунуліся да яго і зашапталі: «Ведзьма! Ведзьма!». Пан Стась, натхніўшыся крыжом, вызірнуў з капліцы. Матулевіча гэты небяспечны погляд прыяцеля развесяліў. Паклаўшы руку на гарду шаблі, ён, усміхаючыся, разглядаў Эўчын твар. Яму прыйшлося не да душы, што драбы торкаюць Эўку крыўдным словам, і ён грозна пакрывіўся.

— Л-л-л-лепш яе прагнаць! — заікаючыся, сказаў пан Стась. — П-п-ан Бог не любіць!

— Яна чалавек! — запярэчыў Юры і ў запале ступіў да варажэі:

— Эўка, скажы, будзе мне бяда?

— Калі сам, пан, не наклічаш, не будзе!

— Сам?! — здзівіўся Юры.

— Сам! — паўтарыла Эўка і раптам падалася ў лівень ды знікла за кутом капліцы.

Хутка навальніца перамясцілася пад Бакшты. Юры, Стась і салдаты прадоўжылі шлях. І нарэшце іх сустрэла вёска і двор Юр'евых бацькоў, загароджаны частаколам і брамаю. Калі яны яшчэ ехалі вуліцай, Юры налічыў восем пустых двароў, гаспадары якіх, пэўна, былі забітыя ці ўзятыя ў палон стральцамі. Але і з ацалелых хатаў ніхто не выйшаў, каб прывітацца...

## Шляхецкія абгаворы

Назаўтра адзначалі доўгачаканую сустрэчу; заехалі з дзясятак суседзяў, якія перажылі па літасці Божай утрапёнасць казацкага і маскоўскага разгулу. У мінулым утрая больш з'язджалася, а цяпер, на жаль, рэдкая душа ацалела: пана Залесю казакі забілі, Шэпурку і Лаевіча маскалі, Вярыгу яго ж мужыкі пранеслі на вілах ад варотаў да могілкавых бяроз, пан Руцэвіч падаўся ў Жмудзь, каб схавацца, і па дарозе, абкрадзены, з голаду акалеў, Трызна ў войску загінуў пад Полацкам, Балевіча

пад Менскам забілі... Ды і ўсе, хто цяпер сядзеў за сталом, нацярпеліся ліха, нават бацька, як зразумеў Юры з кароткага аповеду, месяц карміў крывёй камароў на балотных выспах.

Але выпілі, забыліся мінулыя страхі, і пачалася пахвальба. Юры і Стась, як непасрэдныя ўдзельнікі бітвы пад Палонкай і ўзяцця Менску, абавязаныя былі сагрэць душу шляхецкай грамады аповедамі аб поспехах нашых харугваў. Не чакаючы запрашэнняў, Юры пусціўся ў пераказ знакамітай бітвы:

— Гетман Павел Сапега вырашыў узяць абозы Хаванскага і аддаў загад рухацца да Ляхавіч, куды сцягваліся харугвы. Перакрыўшы шлях князю Хаванскаму, войска стала ў полі. Дзве харугвы крылатых гусараў і наш полк, на чале з Варанькавічам, былі вызначаныя ў запас і схаваныя ў лесе. Расейская пяхота набліжалася на нашую пяхоту... Стукнулі стрэльбавыя залпы стральцоў — першы шэраг, другі, трэці. Ліцвіны адказалі агнём, але шум страляніны хутка заціх — войскі сышліся і схапіліся на шаблях. Затоеныя ў лесе палкоўнікі і паручыкі, сабраўшыся разам, варажылі па ляску зброі і сіле крыкаў, хто бярэ верх і ці хутка для іх наступіць час ісці на справу... Праз гадзіну і надышоў — князь Шчарбаты, зламаўшы правае крыло, зайшоў у спіну. Тут гусарскія камандзіры і Варанькавіч загадалі харугвам атакаваць. Палкі Кміціча цяснілі ваяводу Змяева і князя Шчарбатага, забіраючы перамогу. І забралі! Упершыню за пяць гадоў вайны збег з бітвы князь Іван Хаванскі. Толькі паўгоду

назад спаліў ён непакорлівае Берасце, тройчы запар адымаў перамогу ў Абуховіча і Агінскага, а цяпер сам сыходзіў у галоп, толькі пыл падняў на дарозе. Мы яго не маглі дагнаць, — Юры весяла засмяяўся. — Кінуў абоз і параненых, сотнямі здаваліся ў палон стральцы, чатырнаццаць сцягоў узялі. Увесь час у нас быў недахоп у артылерыі, а тут гарматы і порах расейцы пакінулі ў падарунак...

Пан Адам прыглядаў, каб ніхто не падумаў, што Матулевічы выпіць шкадуюць. І да апоўначы ўжо шмат хто спаў: ці за сталом, ці на траве перад домам.

Засталіся шасцёра: гаспадар, пан Мацей, суседзі Лукаш Мацкевіч і пан Мяцельскі, Юры і Стась, якія асілілі іншых тым, што мноства кубкаў хоць і падносілі да ратоў, але праз плячо выплюхвалі. Ужо агні абплылі да донцаў падсвечнікаў, у вачах вісела густая вінная павалока, калі Стась Рэшка, узіраючыся за акно ў начную цемрадзь, успомніў Эўку.

— Бачылі мы тут сёння адну... — цяжка прамармытаў ён. — Цікава, як панове мяркуюць: спяць ведзьмы або не спяць ніколі?

Усе схамянуліся.

— Вось дык пытанне! — чухаючы лоб, пагадзіўся пан Лукаш. — Эўку, калі распрануць, не будзь я Мацкевіч, выявіцца хвост...

— Глупства, пан Лукаш! — сказаў гаспадар. — Эўку ў царкве хрысцілі.

— Э-э, крыж на грудзях, — адказваў Мацкевіч. — А хвост, пан Адам, таксама на адпаведным месцы.

— Глупства! — паўтарыў гаспадар ужо грубавата. — У яе і маці была.

— Памятаю, — кіўнуў пан Лукаш. — Таксама ведзьма...

Гаспадар пашукаў Мацея за сталом і знайшоў яго дужа сонным. Мацей быў шлюбным братам гаспадара, і на памяці Юр'я жыў у доме, магчыма, з-за страчанай нагі. Абудзіўшы яго, пан Адам мовіў:

— Мацей! Памятаеш, Эўчыну маці бачылі, купалася ў крыніцы... Прыгожая ці ведзьма? — і, каб ажывіць ягоны розум, працягнуў кубак: — Пі!

Мацей махам выпіў.

— Прыгожая! — прызнаў ён, утаропіўшыся чамусьці на Юр'я. — Быццам панна нябесная!

— Каго, каго ён з паннай нябеснай ураўноўвае! — жахнуўся Стась Рэшка.

Кароткая мітусня абудзіла пана Бельскага. Дзікім поглядам абвёў ён пакой і забубніў з глыбокай трывогай: «Дзе я? Дзе я? Дзе я?»

— Дрыхні, браце, Мікалай! — пляснуў яго далонню Лукаш. — Ты ў хаце, на печы ляжыш...

П'яны Бельскі падцягнуў да сябе талерку з грудай аб'едкаў і, уладкаваўшы на іх галаву, імгненна заснуў.

...Раніцай гаворка зноў закруцілася вакол Эўкі. Плялі, бачыў Юры, і відавочную лухту: накшталт таго, што Эўка лётае на мятле, што маці яе памылкова пагрыз у лесе ваўкалак («Рысь!» — уставіў пан Адам), але ўсё ж старая ведзьма дапаўзла да хаты і перадала апошнім

уздыхам сваю чароўную сілу дачцэ, і Эўка стала прымаўляць і шаптаць, а пазней закахалася ў смалакура — чалавека пана Матулевіча, а пан Адам на вайну пайшоў і смалакура ўзяў да сябе драбам, а таго татары насадзілі на дзіды.

Гэтыя кругавыя ўспаміны пра Эўку, бачыў Юры, дастаўлялі бацьку непрыемнасць, ён імкнуўся іх перапыніць і перапыніў, здагадаўшыся назваць высокія імёны.

— Эх, панове, аб чым наш клопат: старая шаптуха, маладая... — сказаў пан Адам. — Як стары Радзівіл шведу радзіму нашаптаў — вось вядзьмак!

Лаяць — не хваліць: адмерваць не трэба, колькі ні скажаш — праз бок не перабярэш.

Эўку забылі на паўслове, прычым з прыкрасцю, што выдаткавалі столькі часу. Дружна ўчапіліся ў Радзівілаў. І Нясвіж у іх, і Клецак у іх, і Койданава, і Копысь, і Давыд-Гарадок, і Кейданы, Біржа, Любча, і Мір перахапілі ў Іллінічаў, і Слуцкае княства пераналі ў пасаг за Алелькавіцкую дзеўку. У караля менш войска, чым у гэтых Радзівілаў. Не дае столькі людзям гасподзь Бог, толькі нячысцікі...

Але неўзабаве дружныя абгаворы загаслі. Усе разумелі, што, каб увайшоў сюды Радзівіл — увомірг пакланіліся б і выцерлі рукавом лаўку. Усё можа Радзівіл. Ён у войска дае тысячу конніцы і паўтары тысячы пяхоты. У яго самога гайдукоў тры тысячы. І ўся шляхта на ягоных землях належыць яму нароўні з мужыкамі. Падзьме Радзівіл — і няма шляхціча...

— Так, панове, праўду ксяндзы кажуць: зламаныя ўжо чатыры пячаткі. Конь змярцвелай масці носіць па нашых дарогах смерць, і аблічча людзей прынялі чэрці, — загаварыў Бельскі. — Вось глядзіце, Нячай, панове! «Палкоўнік беларускі». Спачатку шляхту рэзаў, як мяснік, — цар яму за гэта Быхаў і Чавусы даў. Потым наш кароль Ян Казімір даў Чачэрск і староства бабруйскае — ён расейцаў пачаў рэзаць. У нас яшчэ што, а там, у Чавусах і Быхаве, дзе карміліся казакі, і пікнуць не адважваўся шляхецкі чалавек — адразу галава з плячэй, а цела сабакам. Дзякуй Богу, да нас не дайшоў, толькі Мурашку свайго наслаў, таксама чортавага сына!

Гутарку зноў павярнулі на шведаў. Маўляў, не атрымалася рудым шэльмам узяць польскую карону! Таму што Бог не дапамог: у царкву золата не несяце, скнары пратэстанцкія, усё хаваеце ў хатнія кашалькі! Дзякуй Богу, Аліўскі мір шведы складуць з намі і палякамі — тады нам палякі дапамогуць разбіць расейцаў. Сёмы год яны над намі сядзяць…

— Так, сядзяць, — мовіў пан Адам, задаволены пераменай тэмы. — Сядзяць. Думаеце, дарма кароль Ян Казімір надумаў абвяшчаць Богамаці каралевай Польшчы і вялікай княгіняй у Вялікім княстве? Не, нездарма! Цяпер Панна нябесная нам дапаможа ад расейцаў вызваліцца…

— Паверце майму досведу, — узвысіў голас возны Яшчур, — а ў мяне вельмі вялікі досвед, шведы нам дапамогуць…